**Эйдэльштэйн, І.** Дагэтуль сніцца / І. Эйдэльштэйн // Аршанская газета. — 2003. — 15 лют. — С. 2.

## ДАГЭТУЛЬ СНІЦЦА



**Атрымаўшы паведамленне пра тое, што ў дачны домік аднаго з жыхароў раёна «Замосце» пранiклi невядомыя, старшы інспектар аператыўна-дзяжурнай службы гараддзела «Ахова» капітан Валерый Шастакоў неадкладна накіраваў на месца здарэння групу затрымання. І неўзабаве на вуліцы Кастрычніцкай прапаршчык Валерый Осіпаў, старты сяржант Аляксандр Мілюцін і сяржант Міхаіл Скавародка затрымалі з крадзеным раней судзімага аршанца, які сазнаўся ў здзейсненым злачынстве.**

Да прыходу на службу ў органы ўнутраных спраў Валерый скончыў Санкт-Пецярбургскі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту. Працаваў следчым, старшым оперупаўнаважаным аддзялення крымінальнага вышуку Аршанскага аддзела ўнутраных спраў на транспарце.

А неўзабаве пасля заканчэння акадэміі МУС у 1998 годзе перайшоў у гараддзел «Ахова» на пасаду старшага інспектара – дзяжурнага АДС.

Разам са сваім памочнікам прапаршчыкам Уладзімірам Кароткіным прымае за змену не адну арыенціроўку аб здзейсненых злачынствах – крадзяжах, угонах аўтатранспарту, разбоях і інш. І на кожнае паведамленне неабходна рэагаваць без прамаруджвання. Пры гэтым пастаянна быць на сувязі і ўзаемадзеянні з аддзеламі ўнутраных спраў гарнізона міліцыі.

Добрым памочнікам у службе для Валерыя з'яўляецца спорт, з якім сябруе з дзяцінства. Неаднаразовы прызёр абласных і рэспубліканскіх спаборніцтваў па футболе і міні-футболе. Захапляецца ўсходнімі адзінаборствамі. Прывівае любоў да спорту васьмігадоваму сыну.

Аднак паважаюць Шастакова ў аддзеле не толькі за высокі прафесіяналізм і спартыўныя дасягненні. Тут ведаюць яго і як былога воіна-афганца, які з 1986 па 1988 год выконваў свой інтэрнацыянальны доўг у Афганістане. Аднак (у сілу сваёй прыроджнай сціпласці) не асабліва расказвае пра баявыя ўзнагароды ды адмеціны на целе і душы, што пакінулі «духі». Рэйды, засады, суправаджэнне калон з грузамі... І страты баявых сяброў – дагэтуль сніцца капітану Шастакову.

**І. Эйдэльштэйн**